# Дзеннік нарады

## З вялікай прамовай выступіў Нікалай Фёдаравіч Гікало

### Ранішняе паседжанне 8 студзеня

Радзіма і Сталін. Гэтыя словы дзесяткі раз вымаўляліся на нарадзе. Сэрцы жанчын б'юцца бязмернай любоўю і адданасцю вялікаму Сталіну, цудоўнай радзіме. Гэтымі словамі пачынаюць свае выступленні амаль усе трактарысткі.

— Мы шчаслівы, што жывем у такой краіне, дзе жанчына мае права на працу, вучобу і адпачынак, дзе яна вольная і раўнапраўная з мужчынамі, — гаварыла трактарыстка Мялічэнка Фядора з Гарадоцкай МТС. — І ўсё гэта даў нам вялікі Сталін і Комуністычная партыя!

Доўга незмаўкаючымі апладысментамі і выгукамі «ўра» выказвала ўся аўдыторыя сваю салідарнасць з думкаю выступаючых.

На соцыялістычных палях жанчыны з гонарам кіруюць складанымі машынамі — камбайнамі, трактарамі і ільнацерабілкамі. У большасці дзе. Але працавалі чэсна і не адсталі.

Знатны брыгадзір Капыльскай МТС Зоня Рачок мае бліскучыя паказчыкі. Кожны трактар брыгады мае апрацоўку ў 1.100 га. Лепшая трактарыстка-стаханаўка Наркевіч Адэля апрацавала трактарам 1200 га. На 1937 год яна абавязалася даць 1500 га.

— Я ўзяла абавязацельства, — расказвала Мураўёва з Высачанскай МТС, — даць 1000 га, і сваё слова стрымала. У 1937 годзе буду працаваць яшчэ лепш, і ўзару не менш 1200 га.

З пачуццём асаблівай гордасці расказвалі трактарысткі пагранічных МТС аб сваёй рабоце. Трактарысткам Цімкавіцкай МТС прыходзілася працаваць за 50 метраў ад граніцы. З-за мяжы з зайздрасцю паглядвалі па дзяўчат, кіруючых сталёвым канём. А там, па вузкіх доўгіх палосках худыя конікі ледзь цягнулі плугі. Які рэзкі кантраст, якое глыбокае бяздонне аддзяляе два светы — свет шчаслівага юнацтва і свет нядолі і гнёту.

На нарадзе выступалі і трактарысткі, якія не маглі асабліва пахваліцца сваёй работай. Яны рэзка крытыкавалі работу МТС і райкомаў комсамола за дрэнную дапамогу ім.

Гордасцю былі поўны іх выступленні за сваю радзіму, за сваё шчаслівае жыццё. Яны гаварылі аб вялікай гатоўнасці стаць на абарону соцыялістычнай краіны. Прапанавалі арганізаваць пры МТС курсы вадзіцеляў танкаў. Сям-там такія курсы ўжо арганізаваліся, і дзяўчаты-трактарысткі вучацца ўзорна.

— Калі вораг паспрабуе сунуць сваё свіное рыла ў наш квітнеючы совецкі сад, мы, жанчыны-трактарысткі, зменім трактар на танк і нанясем ворагу сакрушальны ўдар.

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы